# Па ідэі — на выставу!

**Якасныя выхадныя — залог прадуктыўнасці ўсяго тыдня і штуршок да генерацыі свежых ідэй. Мы сабралі для вас культурныя падзеі, наведванне якіх стане цудоўнай перазарадкай і натхніць на новыя творчыя здзяйсненні.**

Пазнаёміцца з выбітным беларускім літаратарам запрашае **Нацыянальная бібліятэка Беларусі**. Экспазіцыя "У краіне мар", прысвечаная 130-годдзю з дня нараджэння Канстанцыі Буйло, расказвае пра жыццёвы і творчы шлях майстра слова. Сярод экспанатаў — першы зборнік лірыкі "Курганная кветка", рэдактарам якога быў Янка Купала, выданні з музейных і бібліятэчных фондаў, фотаздымкі і рукапісы. Асаблівая каштоўнасць — рэчы паэтэсы, якія беражліва захаваў яе сын. Наведаць выставу можна да 31 сакавіка.